# БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАСЦЮМ ЯК ІНСТРУМЕНТ ФАРМІРАВАННЯ ІМІДЖА БЕЛАРУСІ

# BELARUSIAN FOLK COSTUME AS A TOOL FOR FORMING THE IMAGE OF BELARUS

Т. Рабец
T. Rabets

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў
Мінск, Беларусь
Belarusian State University of Culture and Arts
Minsk, Republic of Belarus
*e-mail: rabez72@mail.ru*

У артыкуле дадзена характарыстыка асаблівасцей традыцыйнага беларускага адзення, вызначаны роля і месца беларускага нацыянальнага касцюма ў працэсе фарміравання станоўчага іміджа Беларусі.

*Ключавыя словы:* імідж краіны; мода; беларускі нацыянальны касцюм; нацыянальны стыль; этнічны стыль; фальклорны стыль; арнамент.

The article describes the features of traditional Belarusian clothing, defines the role and place of the Belarusian national costume in the process of creating a positive image of Belarus.

*Keywords:* country image; fashion; Belarusian national costume; national style; ethnic style; folk style; pattern.

У сучасным свеце краіны з малой эканомікай, як правіла, не могуць забяспечыць сваё развіццё без ёмістага міжнароднага рынку. Для рэалізацыі прарыўных праектаў, стварэння новых галін эканомікі, інавацыйных вытворчасцей неабходна аб›ядноўваць навукова-тэхнічны, кадравы і фінансавы патэнцыялы краін-партнёраў. Таму для Рэспублікі Беларусь, якая абрала сваёй стратэгіяй інавацыйнае развіццё, задача фарміравання пазітыўнага міжнароднага іміджу з›яўляецца надзвычай актуальнай. Пры фарміраванні іміджу краіны недастаткова мець перавагі ў якіх-небудзь галінах эканомікі і культуры. Важна паведаміць пра гэтыя перавагі мэтавай аўдыторыі, зрабіць пэўныя крокі, якія вызначаюць прыярытэтнае месца і ролю Беларусі ў глабалізуючымся свеце, падзеленым на зоны ўплыву.

У паняцце іміджу краіны ўваходзіць шмат складнікаў: людзі, гісторыя, падзеі, прывабнасць гарадоў і пэўных мясцін, турызм, інвестыцыі, экспарт і інш. Усе гэтыя складнікі знаходзяцца ў цесным

узаемадзеянні і схільныя трансфармацыі. Пытанні пра тое, як развіваць гэтыя кірункі, неаднаразова ўздымаюцца на разнастайных канферэнцыях і семінарах. Над вобразам Беларусі працуюць усе міністэрствы краіны, у кожнага з якіх свой напрамак дзеяння: ад эканамічнага да культурнага, бо імідж складаецца з успрымання краіны, брэндаў, якімі славіцца краіна, дасягненняў ў спорце, навуцы і г.д.

У аснове фарміравання іміджу краіны ляжыць тры асноўныя працэсы. Першы працэс – гэта тое, што мы самі робім (дзяржава, грамадскія аб›яднанні, бізнэс і інш.), якую інфармацыю мы накіроўваем у вялікі свет, якую сістэму каштоўнасцяў рэтранслюем. Другі працэс – гэта тое, як выяўляюць сябе нашы турысты, прадпрымальнікі, навуковыя і іншыя суайчыннікі за мяжой, як яны выбудоўваюць свае адносіны з замежнымі партнёрамі. І нарэшце, трэці працэс – гэта тое, як іншаземныя турысты, якія сутыкаюцца з нашым сервісам, фарміруюць ўяўленні пра Беларусь і перадаць інфармацыю пра краіну з вуснаў у вусны.

Пры рэалізацыі ўсіх трох накірункаў працэсу фарміравання іміджу краіны асаблівае гучанне набываюць пытанні, звязаныя з развіццём нацыянальнай культуры, культуры міжнацыянальных адносінаў і гарманізацыі этнічных узаемаадносінаў. Цікавасць да нацыянальнай тэмы характэрна для самых разнастайных абласцей сучаснай культуры. Народная тэма знаходзіць сваё развіццё ў ландшафтным дызайне і дызайне інтэр›еру, адраджэнні нацыянальных традыцый, рамёстваў, музыцы, модзе і г.д. І менавіта нацыянальны касцюм набывае высокую культурную каштоўнасць і з›яўляецца адным з этнічных атрыбутаў народа, свайго роду візітоўкай краіны. Гэта не проста адзенне, а адлюстраванне характару нацыі.

У цяперашні час у грамадстве, як ніколі раней, наспела неабходнасць ў адзенні, якое не толькі задаволіла бы патрабаванні людзей розных узроставых і прафесійных груп і розных сацыяльных пластоў, але і дапамагала бы ідэнтыфікаваць сябе з тым або іншым этнасам або сацыякультурнай агульнасцю. Акрамя таго, нацыянальны касцюм выступае ў ролі носьбіта рэкламы, з дапамогай якога можа эфектыўна фарміравацца брэнд-імідж не толькі тавара, паслугі, фірмы і г.д., але імідж краіны ў цэлым. Нельга не заўважыць, што беларускія жаночыя касцюмы з элементамі этнічнага стылю ўвесь час цэняцца за якасць, якая зарэкамендавала сябе далёка за межамі Беларусі. Адзенне з Беларусі лічыцца эталонам моды і стылю, а новыя беларускія калекцыі атрымліваюць найвышэйшыя ўзнагароды на міжнародных конкурсах і выставах. Так, напрыклад, у 2017 годзе беларусы сталі другімі ў конкурсе нацыянальных касцюмаў у Пекіне. У мерапрыемстве ўдзельнічалі

прадстаўнікі нацыянальных дыяспар, якія пражываюць у Кітаі. Усяго было заяўлена 17 калектываў – прадстаўнікоў сваёй краіны. Беларусы на конкурсе выканалі танец у касцюмах з беларускімі арнаментамі. На вялікім экране тым часам трансляваўся відэаролік з пейзажамі вядомых мясцін Беларусі.

Даследуючы этнічныя тэндэнцыі ў дызайне адзення, неабходна ўнесці адрозненні ў паняцці: этнічны, нацыянальны і фальклорны стылі. У калекцыях мадэльераў этнічны і нацыянальны стылі часта пераплятаюцца адзін з адным. Аднак з тэарэтычнага пункту гледжання паміж касцюмам у нацыянальным і этнічным стылі існуе пэўная розніца. Касцюм у нацыянальным стылі прадугледжвае зварот да традыцый, а іх абагульненне і інтэрпрэтацыя і ў большай ступені арыентаваны на нацыянальны каларыт, нюансы стылю той або іншай краіны.

У адрозненне ад нацыянальнага стылю касцюм у стылі «этна» – гэта сучасны касцюм. Этнічны стыль адсылае не да рэканструкцыі традыцыйных форм нацыянальнага касцюма, а да сцвярджэння ідэі ладу жыцця ў гармоніі з прыродай. Яркія выявы ствараюцца дзякуючы выкарыстанню нацыянальных арнаментаў, матэрыялаў, незвычайных канструктыўных формаў, менавіта гэта робіць вобраз арыгінальным. Праз ужыванне традыцыйных спосабаў стварэння тканін і дэкору, выкарыстанне прыродных кветак у гарнітуры, асобныя арнаментальныя, канструктыўныя элементы ў сучасным дызайне – вось той няпоўны пералік сродкаў, пры дапамозе якіх ствараецца этна-стыль.

Фольк-стыль азначае стыль у сучасным адзенні, які выкарыстоўвае элементы народнага касцюма [2, с. 216]. Пры гэтым касцюм, выкананы ў фальклорным стылі, можа быць рамантычным па характары, упрыгожаным карункамі (што таксама ўласціва стылю «фэнтазі») і дапоўненым аксэсуарамі з натуральных матэрыялаў. Падобны прыклад сведчыць пра пэўнае ўзаемапранікненне, так званую дыфузію – змешванне стыляў. Фальклорнае адзенне захоўвае натуральныя тканіны, вязаныя карункі і вышыўкі. Спецыяліст у вобласці мадэлявання па народных матывах Г. С. Горына пісала: «Яно (фальклорнае адзенне) адкрыла для моды не толькі структуру народнага касцюма, яго дэкараванасць, але і дух аптымізму, радасці і веры ў добры пачатак чалавека» [1, с. 34].

Нацыянальны, этнічны і фальклорны стылі – гэта невычарпальная крыніца натхнення, з дапамогай якой сучасныя дызайнеры могуць ствараць розныя па сваёй сэнсавай нагрузцы вобразы: асляпляльныя або таямнічыя, мяккія або дзёрзкія. Пры гэтым любы касцюм з народнымі элементамі становіцца поўным адлюстраваннем агульнага характару нацыі, яе станаўлення і развіцця, асаблівасцей побыту і навакольнай прыроды.

Беларускі касцюм, нягледзячы на тое, што мае агульныя карані з украінскім і рускім нацыянальнымі касцюмамі і фарміраваўся на аснове ўзаемаўплыву літоўскай, полькай, рускай і ўкраінскай традыцый, тым не менш адрозніваецца самабытнасцю і з›яўляецца самастойнай з›явай. Акрамя таго, можна заўважыць, што, з аднаго боку, ён увабраў у сябе тэндэнцыі інтэрнацыянальнага гарадскога касцюма, дзякуючы чаму добра ўпісваўся ў агульнаеўрапейскі кантэкст, а з другога боку, спалучаючы ў сабе практычнасць і эстэтычнасць, ён адлюстроўвае мясцовыя традыцыі і сацыяльны статут прадстаўнікоў народа, светапогляд майстроў, якія выраблялі яго. Элегантныя лініі, ідэальны крой кардынальна мяняюць уяўленні пра беларускі касцюм. Напрыклад, у вясельным касцюме Палесся практычна няма арнаментаў. Але тут вялікая ўвага надаецца сілуэту, прапарцыйным суадносінам элементаў, пластыцы традыцыйнага касцюма. І менавіта на паясах робіцца галоўны акцэнт у касцюме.

Асаблівасці традыцыйнага беларускага касцюма складаліся на працягу вельмі працяглага часу. Галоўнымі элементамі традыцынага касцюма з’яўляліся ільняная кашуля, спадніца, андарак (зімовая, ваўняная спадніца), фартух. Цікава, што фартух у паўсядзённым жыцці выконваў не толькі ахоўную і чыста ўтылітарную функцыю, але і магічную: з падлеткавага ўзросту дзяўчынкі ў абавязковым парадку павінны былі насіць фартух, паколькі фартух з’яўляўся дадатковым засцярогам жаночага ўлоння. Гэта такая частка адзення, якую дзяўчынкі, упершыню пачынальна ткаць ці вышываць самі. Па тым, як быў вытканы ці вышыты фартух, можна было судзіць пра мастацкія здольнасці і майстэрства дзяўчынкі – будучай нявесты, жонкі, гаспадыні. Як толькі дзяўчынка апранала ўласнаручна выраблены фартух, яна ўжо лічылася дзяўчынай. Яе маглі запрашаць у кампаніі больш сталай моладзі.

Нягледзячы на тое, што некаторыя ўзоры беларускіх касцюмаў з нацыянальнымі элементамі адсылаюць нас да класічнай выявы беларуса: белыя кашулі, арнаменты і чырвоныя вышыўкі, нельга сказаць, што беларускі касцюм вызначаецца аднастайнасцю і нязменнасцю. Разнастайнасць беларускіх касцюмаў у першую чаргу звязана з іх рэгіянальнымі адрозненнямі. Касцюм кожнага рэгіёну Беларусі мае свае асаблівасці, адрозніваецца і кампазіцыйным строем, і каларыстыкай, і дэкаратыўным аздобленнем. Чым далей на поўнач Беларусі размяшчаўся пэўны рэгіён, тым больш яркімі станавіліся ўборы нашых продкаў, і наадварот, на поўначы Беларусі пераважаў вельмі сціплы дэкор у адзенні. Аднак пры ўсім гэтым чырвоны і белы колеры былі галоўнымі атрыбутамі беларускага касцюма і маюць глыбокую сімволіку. Белы фон – колер чысціні. Чырвоны – колер сонейка, крыві як сімвала жыцця,

і ўвогуле сімвал жыцця. Каляровае прадзіва нашы продкі рабілі пры дапамозе розных настояў раслін. Нягледзячы на тое, што белая вышыўка звязвалася са смяротнай сімволікай, нароўні з традыцыйным малым дэкорам сустракаліся ўзоры ўнікальнай белай вышыўкі. Часцей за ўсё такое ўпрыгожванне было характэрна для вясельных убораў, што злучалі з уяўленнямі пра смерць дзяўчыны і нараджэннем жанчыны і жонкі. Таму яна апранала на першы дзень вяселля белыя адзенні з белай вышыўкай.

Нацыянальны арнамент, без якога не абыходзіўся амаль ні адзін беларускі касцюм, – гэта не проста ўпрыгожванне, але і код, традыцыйны набор сімвалаў і колераў, якія выкарыстоўвалі нашы продкі. Па сімвалічным арнаменце можна было не толькі распазнаць паганскія матывы, але і прасачыць гісторыю роду. Акрамя таго, усе сімвалы арнамента – вельмі моцныя знакі, якія былі прызначаны засцерагаць чалавека, у сувязі з чым арнаменты на адзенні пераважна размяшчалі толькі на каўнерах, манжэтах, манішках, галаўных уборах, вакол твару, адным словам там, дзе ёсць прарэхі, праз якія зло можа патрапіць да цела чалавека. Менавіта на рукавах можна ўбачыць больш за ўсё пунсовага дэкору. Нашы продкі лічылі іх самым магутным ахоўным месцам і ўпрыгожвалі сімвалічнымі засцярогамі ў выглядзе вышытых крыжоў. Цікава, што чырвоная нітка праходзіла праз шматлікія швы на кашулі. Такая пунсовая маркіроўка, на думку нашых продкаў, не дазваляла нячыстай сіле трапіць пад палатно.

Багацце каларыта арнаментаў звычайна дасягалася пры дапамозе розных арыгінальных тэхнік, у тым ліку пры дапамозе спецыяльнага размяшчэння простых дэталаў узору з іх пэўным рытмам. Яркімі характэрнымі рысамі беларускага арнаменту можна назваць пераважнае выкарыстанне розных геаметрычных фігур: кругоў, зорак, ромбаў, стужак, крыжоў, ліній (прамых, зігзагападобных), шасцівугольнікаў. Раслінны матыў сустракаецца радзей і пераважна складаецца з кветак, лісця, пладоў, часцей за ўсё вінаграду. Анімалістычны матыў складаецца з выяў, стылізаваных пад жывёлу, або дэталей яе фігур.

Калі больш дэталёва даследаваць асаблівасці беларускіх касцюмаў, то можна заўважыць, што арнаменты вельмі розныя: дзесьці ён складаецца толькі з тонкіх і шырокіх палосачак. Тое ж самае можна сказаць і пра ромба-геаметрычны арнамент, які таксама лічыцца для нас вельмі характэрным, але ў розных раёнах Беларусі ён свой. Нават чырвоны колер, які спрадвеку спалучаецца з белым палатном, не такі пунсовенькі, які выкарыстоўваюць у сучасных вышыўках. У сувязі з тым, што фарбы для нітак выраблялі з раслін, колер вышыўкі меў глыбейшы, больш насычаны, бліжэй да бардовага ці карычнявата-чырвонага колеру. Гэта быў стрыманы і больш высакародны колер.

Такім чынам, можна заўважыць, што беларускі народны касцюм – паняцце больш шырокае і цікавае, чым наша ўяўленне пра яго. І вельмі хочацца верыць, што сённяшняя мода на «беларускасць» у адзенні не будзе імгненным капрызам, а стане нараджэннем сапраўднай, глыбокай цікавасці да традыцый і гісторыі сваёй краіны. Мадэляванне сучаснага адзення з выкарыстаннем элементаў традыцыйнага беларускага касцюма ўносіць істотны ўклад у распрацоўку новых прынцыпаў і прыемах мастацкай выразнасці адзення беларусаў, што ў сваю чаргу будзе садзейнічаць самавыяўленню і ідэнтыфікацыі беларускага народа і фарміраванню культурнага іміджа Беларусі.

### БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Горина, Г. С. Народные традиции в моделировании одежды / Г. С. Горина. – М. : Легкая индустрия, 1974. – 184 с.
2. Калашникова, Н. М. Народный костюм (семиотические функции): учебное пособие / Н. М. Калашникова. – М.: Сварог и К, 2002. – 374 с.


# ФАЎСЦІЯНА Ў П’ЕСАХ ЛЕАПОЛЬДА РОДЗЕВІЧА

# THE FAUST-CONCEPT IN THE PLAYS BY LEAPOLD RODZEVICH


Т. С. Супранкова
T.S. Suprankova

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Мінск, Рэспубліка Беларусь
Belarusian State University
Minsk, Republic of Belarus
*e-mail: tatsupr@tut.by*


---


Артыкул прысвечаны аналізу ўплыву топасаў фаўсціяны на п’есы беларускага драматурга Л. Родзевіча. Вывучэнне класікі сусветнай культуры дапамагае сфарміраваць грамадзянскія і патрыятычныя каштоўнасці ў студэнцкай моладзі, таму ў першую чаргу робіцца акцэнт на тых вобразах і матывах, якія удзельнічаюць у міжкультурнай камунікацыі.



*Ключавыя словы:* фаўсціяна; Леапольд Родзевіч; беларуская драматургія; міжкультурная камунікацыя.



The article is dedicated to the influence of the Faust-concept’s toposes upon the plays by L. Rodzevich, the Belarusian playwright. The study of the world